**А. С. Бохан,**
*прарэктар па вучэбнай рабоце*
*УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»,*
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

# ВЫБАР МЕТАДАЛАГІЧНАЙ ПАРАДЫГМЫ ДЛЯ ЗАНЯТКАЎ, ПРЫСВЕЧАНЫХ БЕЛАРУСКАМУ ВЫЯЎЛЕНЧАМУ МАСТАЦТВУ, У МЕЖАХ ПРАДМЕТА "МАСТАЦТВА (АЙЧЫННАЯ І СУСВЕТНАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА)"

Ужо некалькі год прайшло з таго часу, як у беларускія школы вярнуўся прадмет "Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)", аднак падаецца, што наша грамадства яшчэ недастаткова ўсвядоміла значэнне гэтага факта. Вынікі наноў атрыманай магчымасці адкрыць для маленькіх беларусаў свет мастацтва, стварыць умовы для развіцця эстэтычных поглядаў у юным узросце мы зможам убачыць толькі праз пэўны час. А сёння настаўніку для здзяйснення паспяховага навучальнага працэсу і засваення матэрыялу вучнямі неабходна засяродзіцца на пытаннях, якія тычацца якасці, аб'ёму і падачы інфармацыі.

Прадмет "Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)" вылучаецца з шэрагу іншых школьных прадметаў, а таму і падыходы педагогаў да яго выкладання павінны быць адмысловымі. Канешне, настаўнік мусіць выкарыстоўваць агульнапрынятыя, навукова абгрунтаваныя методыкі. Але калі ўлічыць, што адной з мэтаў вывучэння прадмета з'яўляецца фарміраванне ў асобы патрэбы ў кантактах са светам мастацтва, то відавочна, што, толькі арыентуючыся на гэтую канкрэтную асобу, можна выпрацаваць шлях яе эстэтычнага выхавання. Гэта абумоўлівае індывідуальны падыход да кожнага вучня, а таксама важнасць уважлівага стаўлення да ўсіх фактараў, якія ўплываюць на яго развіццё: агульны ўзровень ведаў, спецыфіка рэагавання, магчымасць наведваць установы культуры, доступ да інфармацыі і інш. Задача настаўніка – не проста заахвоціць вучня, але і паказаць яму магчымасць далейшага самаўдасканалення на шляху спасціжэння таямніц мастацтва.

Улічваючы вышэйсказанае, можна сцвярджаць, што ў выкладанні прадмета "Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)" для педагога адкрываюцца шырокія магчымасці выбару метадалагічнай парадыгмы, якая будзе стасавацца з канкрэтнымі ўмовамі, у якіх знаходзяцца настаўнік і вучні. Выбар метадаў выкладання будзе таксама істотна залежыць ад канкрэтнай структурнай часткі матэрыялу, які павінен быць засвоены навучэнцамі.

Не спыняючыся на праблемах адзнак вучняў, колькасці часу, адведзенага для заняткаў па дысцыпліне, што, безумоўна, застаецца актуальным, хацелася б акцэнтаваць увагу на тым, што ў сённяшніх падручніках, ды і ў самой назве прадмета, такі складнік, як айчыннае мастацтва, выведзены на першы план. Невыпадкова матэрыялы, прысвечаныя айчыннаму мастацтву, займаюць асаблівае месца ў агромністай скарбніцы набыткаў сусветнай культуры.

У кантэксце праблемы падыходаў да выкладання гісторыі беларускага мастацтва як складніка прадмета "Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)" найбольш важнымі падаюцца наступныя пытанні:

1) разуменне патэнцыялу матэрыялаў, прысвечаных айчыннаму мастацтву, і прыёмы стварэння і расстаноўкі сэнсавых акцэнтаў падчас заняткаў;

2) роля навуковага забеспячэння выкладання прадмета;

3) спецыфічныя прыёмы актывізацыі кагнітыўных здольнасцяў навучэнца падчас вывучэння з'яў менавіта айчыннай культуры.

Гісторыя мастацтваў з'яўляецца надзвычай аб'ёмным комплексам ведаў, які не абмяжоўваецца звесткамі пра этапы развіцця відаў мастацтва. Пры вывучэнні прадмета павінна фарміравацца бачанне стылёвага адзінства разнастайных сродкаў мастацкага выяўлення, характэрных для пэўнай эпохі, разуменне важнай ролі культурных узаемаўплываў розных краін і ўсведамленне самой сутнасці мастацкай творчасці – адлюстроўваць ідэі грамадства.

Таму вельмі важнымі ў кантэксце выкладання прадмета бачацца ідэалагічныя акцэнты, якія павінен рабіць выкладчык, распавядаючы пра беларускае мастацтва. Сёння надзвычай надзённай з'яўляецца праблема выхавання грамадзяніна ва ўмовах існуючай сістэмы адукацыі. Відавочна, што пры вывучэнні твораў менавіта беларускага мастацтва найбольш ярка выяўляецца патэнцыял прадмета не толькі ў справе эстэтычнага выхавання, але і патрыятычнага. Прытым працэс патрыятычнага выхавання можа адбывацца надзвычай натуральна, нязмушана. Праз фарміраванне разумення вялікай каштоўнасці набыткаў айчыннай культуры, усведамлення таго, што гісторыя мастацтва Беларусі з'яўляецца неад'емнай і важнай часткай гісторыі ўсяго сусветнага мастацтва, значна прасцей і эфектыўней зрабіць вучню "прышчэпку" ад нацыянальнага нігілізму, чым даводзячы пра перавагу супрацьстаяння знешняму агрэсару ў

саюзе з іншай дзяржавай ці надзяляючы нейкім адмысловым прыдуманым значэннем новастораныя сімвалы.

Паслядоўнасць размяшчэння матэрыялу ў параграфах падручніка дазваляе настаўніку выкладаць інфармацыю, якая тычыцца помнікаў айчыннага мастацтва, у кантэксце мастацтва сусветнага. Заданні, змешчаныя пасля структурных частак, не проста актуалізуюць інфармацыю, але і робяць адсылкі да прац сучасных беларускіх мастакоў. Такі падыход абумоўлены абавязковай патрэбай звярнуць увагу вучняў на сённяшняе развіццё айчыннага мастацтва. Гэта дапаможа не проста засвойваць матэрыял, але і ўспрымаць гісторыю мастацтва як непарыўны працэс, падштурхне да зацікаўленасці найноўшымі з’явамі мастацкай творчасці.

Зразумела, не трэба абмяжоўвацца толькі творамі, прадстаўленымі ў падручніках. Напрацаваная выкладчыкам у працэсе падрыхтоўкі да заняткаў калекцыя рэпрадукцый работ беларускіх мастакоў, якія адсылаюць да шэдэўраў айчыннага і сусветнага мастацтва, дапаможа візуалізаваць ідэю повязі часоў і культур.

Міжпрадметная прырода прадмета “Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)” найбольш ярка выяўляецца ў параўнанні твораў розных відаў мастацтва, прысвечаных гістарычным персанажам і падзеям. Узбагаціць заняткі дапаможа ініцыяванае выкладчыкам знаёмства вучняў з творамі беларускіх пісьменнікаў – У.Караткевіча, К.Тарасава, У.Арлова, Л.Дайнэкі, В.Іпатавай, Л.Рублеўскай, якія прысвечаны айчыннай гісторыі і ўводзяць чытача, сярод іншага, у кантэкст часу стварэння пэўных мастацкіх твораў. А эмацыйнае ўздзеянне літаратуры дадаткова ўзмацніць уражанне ад твораў выяўленчага, музычнага мастацтва.

Падаецца важным акцэнтаваць увагу вучняў на стылёвых адзнаках твораў айчыннага мастацтва. Разгляд беларускай мастацкай спадчыны ў кантэксце асаблівасцяў візантыйскіх традыцый або еўрапейскіх стыляў наблізіць да разумення далучанасці культуры беларускіх земляў да агульных мастацкіх працэсаў. Безумоўна, падчас гэтага разгляду неабходна рабіць адсылкі да інфармацыі, атрыманай на занятках па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі, узгадваць значныя падзеі, якія паўплывалі на культурныя сувязі.

Адным з самых дзейсных спосабаў праілюстраваць значнае месца твораў айчыннага мастацтва ў развіцці сусветнай мастацкай культуры, вызначыць яго адметнасць стане аналіз прац беларускіх і замежных аўтараў на занятках, якія падводзяць вынік вывучэння матэрыялаў раздзела. У межах “Творчай майстэрні” можна стварыць умовы для самастойных разважанняў вучняў аб асаблівасцях развіцця беларускага мастацтва ў пэўны гістарычны перыяд.

Фарміраванне ў вучняў адчування значнасці айчыннай культуры, жадання ганарыцца яе дасягненнямі – гэта надзейная база для выхавання грамадзяніна.

Надзвычай важная роля ў гэтым працэсе належыць прафесійна падрыхтаванаму, эрудыраванаму ў пытаннях гісторыі мастацтва педагогу. Спецыфіка сучаснага інфармацыйнага поля дапамагае аператыўна атрымаць патрэбныя звесткі, не гарантуючы абсалютнай упэўненасці ў дакладнасці гэтых звестак. І падчас падрыхтоўкі да заняткаў, і ў непасрэднай працы з вучнямі настаўнік вымушаны сутыкацца з шэрагам праблем.

Раздзелы, прысвечаныя мастацтву Беларусі, у азначаным кантэксце могуць выклікаць найбольш вострыя пытанні. Гэта звязана ў першую чаргу з крыніцамі інфармацыі, якімі карыстаецца для падрыхтоўкі да заняткаў настаўнік. Калі навукова-папулярнай літаратуры па гісторыі еўрапейскага ці рускага мастацтва больш чым дастаткова, то сістэматызаваную, якасную інфармацыю па беларускаму мастацтву прадстаўляюць нешматлікія выданні.

На жаль, і ў віртуальнай прасторы сёння бракуе рэсурсаў, якія можна было б прапанаваць у якасці надзейнай крыніцы для сістэматызацыі ведаў пра беларускае мастацтва. Выключэннем з’яўляецца сайт “Глобус Беларусі”, але ён прысвечаны толькі архітэктурным помнікам.

Спробы сістэматызаваць гісторыю беларускага мастацтва, канешне, прадпрымаліся на працягу апошніх дзесяцігоддзяў (напрыклад, можна ўзгадаць разнастайныя дапаможнікі для студэнтаў айчынных і замежных устаноў вышэйшай адукацыі). Але на сённяшні дзень маецца толькі некалькі выданняў, дзе паслядоўна выкладзена інфармацыя, якая тычыцца мастацтва беларускіх зямель ад першабытнасці да найноўшага часу. Гэта найперш – “Гісторыя беларускага мастацтва” ў шасці тамах, падрыхтаваная ў 1987–1994 гг. супрацоўнікамі Акадэміі навук БССР, і двухтомнае выданне Б.А.Лазукі “Гісторыя беларускага мастацтва”, якое ўбачыла свет у 2007 годзе. Вышэйзгаданыя кнігі даступныя ў электронным варыянце, і настаўніку не складзе праблемы азнаёміцца з іх зместам. Каштоўнасць названых выданняў менавіта ў комплекснай падачы інфармацыі і структурным падыходзе. Аднак трэба адзначыць, што гэта толькі аптымальны аб’ём інфармацыі для таго, каб пачаць пашыраць свае веды, бо відавочна, што сёння настаўніку недастаткова “ўкладацца” ў аб’ём падручніка.

Таму ў працэсе падрыхтоўкі да заняткаў неабходна звярнуцца да манаграфій навукоўцаў,

якія глыбока распрацоўвалі канкрэтную праблематыку. У адрозненне ад абагульняючых выданняў, існуе вялікая колькасць грунтоўных навуковых прац, прысвечаных разнастайным з’явам беларускага мастацтва. Айчынная навука можа ганарыцца шэрагам выбітных даследчыкаў, мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў, архітэктараў, філолагаў, якія на працягу другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзяў стварылі вялікую базу для далейшых досведаў у пытаннях пластычных мастацтваў. Для знаёмства вучняў з гісторыяй старажытнага мастацтва Беларусі настаўніку неабходна звярнуцца да прац археолагаў М.М.Крывальцэвіча, М.М.Чарняўскага, Э.М.Зайкоўскага, Л.У.Дучыц. Этапы развіцця архітэктуры Беларусі адлюстраваны ў працах В.А.Чантурыі і Ю.В.Чантурыі, Т.В.Габрусь, А.І.Лакоткі, А.А.Трусава, Ю.А.Якімовіча, І.М.Слюньковай, А.М.Кушнярэвіча, А.М.Кулагіна, А.С.Шамрук. Пытанням станковага і манументальнага жывапісу, скульптуры, графікі прысвечаны кнігі В.В.Церашчатавай, Н.Ф.Высоцкай, В.Д.Бажэнавай, В.Ф.Шматава, Ю.В.Хадыкі і А.Ю.Хадыкі, А.М.Пікулік, М.М.Нікалаева, А.А.Ярашэвіча, Л.Н.Дробава, Ю.А.Піскуна, А.К.Лявонавай, В.І.Жука, М.Р.Баразны, М.Л.Цыбульскага, А.В.Мядзведзскага і С.В. Мядзведскага. Інфармацыю па гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва можна атрымаць у кнігах М.М.Яніцкай, Я.М.Сахуты, К.А.Лавыш, Г.А.Барвенавай, В.А.Лабачэўскай.

Безумоўна, спецыяльная літаратура, прысвечаная беларускаму мастацтву, не абмяжоўваецца пералічанымі аўтарамі, настаўніку варта сачыць і за свежымі публікацыямі ў навуковых перыядычных выданнях, дзе можна знайсці самую актуальную інфармацыю.

Знаёмства з работамі навукоўцаў дазволяць настаўніку ўпэўнена адчуваць сябе падчас планавання заняткаў. У залежнасці ад пастаўленых задач выкладчык можа рабіць акцэнты на адным з відаў мастацтва, на ўзаемасувязях пластычнай выразнасці твораў з гістарычнымі варункамі, на існаванні творчай асобы ў пэўных умовах і г.д. Такая варыятыўнасць закладзена самім зместам дысцыпліны. Характарыстыка пэўнага перыяду ў гісторыі мастацтва і прыведзеныя ў прыклад адметныя ўзоры, безумоўна, прадугледжваюць далейшае паглыбленне ў матэрыял. У гэтым працэсе роля настаўніка – вельмі важная.

Кругагляд педагога, здольнасць скіраваць вучня на атрыманне патрэбнай менавіта яму інфармацыі надзвычай істотныя для далейшай зацікаўленасці ў прадмеце. Настаўнік можа выбудаваць важныя арыенціры для стасункаў навучэнцаў з мастацтвам у будучым.

Сёння нярэдка мы бачым выданні з рэкламнымі заклікамі: “Прачытаўшы гэтую кнігу, вы будзеце ведаць пра мастацтва ўсё!” або выставы (часам нават рэпрадукцый), дзе арт-медыятары падводзяць гледача да меркавання пра твор мастацтва. Спажыўцамі такога інтэлектуальнага “фастфуду” становяцца неабцяжараныя ведамі рэцыпіенты, якія не ўсведамляюць аб’ём і глыбіню інфармацыі па гісторыі мастацтва і разглядаюць мастацкае выказванне як прапанаваны ім прадукт. Можна завучыць асноўныя вехі, імёны творцаў і назвы іх шэдэўраў, але не набыць здольнасці атрымліваць асалоду ад спасціжэння таямніц, якія тояць у сабе творы мастацтва.

Задача настаўніка прадмета “Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)” – выхаваць гледача, які будзе разумець, што галоўным “прадуктам” мастацтва з’яўляецца яго ўласная рэакцыя на твор. А таму трэба быць падрыхтаваным да ўспрымання. І чым больш грунтоўную базу ведаў будзе мець чалавек, тым больш поўна і ярка ён будзе ўспрымаць мастацтва.

Мастацтва – гэта своеасаблівы спосаб спасціжэння свету, таму на занятках надзвычай патрэбны як дыялог паміж мастацкім творам і гледачом, так і жывы абмен думкамі выкладчыка і вучняў. Разважаючы, знаёмячыся з думкамі іншых, вучань усведамляе, што мастацкі твор можа мець безліч інтэрпрэтацый. Мова мастацтва не патрабуе перакладу, асаблівасць заключаецца ў тым, што кожны разумее яе па-свойму.

Эфектыўным у плане заахвочвання да пазнавальнай дзейнасці будзе стварэнне ўмоў, калі вучань, выконваючы заданні, непазбежна дасягне сваіх маленькіх адкрыццяў. Раздзелы беларускага мастацтва найлепшым чынам спрыяюць такой магчымасці. Настаўнік павінен імкнуцца скіраваць увагу вучняў найперш на тых творах мастацтва, якія могуць знаходзіцца зусім побач. Паход у бліжэйшы музей і пошук інфармацыі пра яго экспанаты, знаёмства з мясцовымі архітэктурнымі помнікамі падораць адчуванне эўрыстычнага моманту і далучанасці да вялікай справы.

Эмацыйны водгук на знаёмства з “жывым” творам мастацтва, безумоўна, пакіне след і можа стаць штуршком для наступнага глыбокага зацікаўлення праблематыкай.

Такія падыходы павінны сфарміраваць звычку здабываць матэрял: шукаць літаратуру, імкнуцца наведваць цікавыя экспазіцыі, вандраваць з мэтай азнаямлення з адметнымі помнікамі мастацтва.

Магчыма, самымі прывабнымі для вучняў стануць параграфы падручнікаў, якія скіраваны на больш грунтоўнае вывучэнне мастацтва шляхам падрыхтоўкі творчых праектаў. Прапанаваныя тэмы заданняў разлічаны на самыя розныя зацікаўленасці і схільнасці вучняў. Роля настаўніка ў

тым, каб зарыентаваць вучня на тое заданне, выкананне якога найлепшым чынам выявіць яго патэнцыял, створыць сітуацыю поспеху.

Да таго ж шырокі спектр заданняў сведчыць пра разнастайныя галіны дзейнасці, дзе патрабуюцца веды па гісторыі мастацтваў. Вучні павінны ўсвядоміць прыкладны характар набытых ведаў: выкананне даследчай працы можа стаць першым досведам навуковай дзейнасці; распрацоўка экскурсійнага маршруту актуалізуе веды па гісторыі мастацтваў для сферы турыстычнага бізнесу; падрыхтоўка выставы дасць разуменне важнасці гісторыі мастацтваў для экспазіцыйнай дзейнасці; праца над прэзентацыяй і выступленне падкрэсляць важнасць ведаў у выкладчыцкай дзейнасці; праца над віртуальным праектам або сцэнарам тэлерэпартажу засведчыць магчымасці прымянення ведаў пры стварэнні лічбавых прадуктаў і ў дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі.

Змест прадмета "Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)" дазваляе настаўніку ў поўнай меры выявіць сваю творчую індывідуальнасць і выбраць найбольш эфектыўныя, на яго думку, падыходы да падачы матэрыялу. Тады да яго выхаванцаў абавязкова прыйдзе разуменне таго, што працэс знаёмства з мастацтвам бясконцы і непарыўны.

Паспяховым вынікам навучання стане сфарміраваная ў вучня патрэба пастаянна кантактаваць з творамі мастацтва, цікавіцца культурным жыццём, не спыняцца ва ўдасканаленні ведаў.

**Рэкамендаваная літаратура для падрыхтоўкі настаўніка да заняткаў па параграфах падручніка "Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)", прысвечаных беларускаму выяўленчаму мастацтву:**


1. Іканапіс Заходняга Палесся XVI - XIX стст. / В.Ф.Шматаў [і інш.]. – Мінск : Бел. навука, 2002. – 348 с.
2. Архітэктура Беларусі: у 4 т. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; рэдкалегія: А. І. Лакотка [і інш.]. – Мінск: 2005 –2009.
3. Баженова, О.Д. Радзивилловский Несвиж. Росписи костела Божьего Тела / О. Д. Баженова. – Минск : Харвест, 2010. – 414 с.
4. Баразна, М. Р. Беларуская кніжная графіка 1960–1990-х гадоў / М.Р.Баразна. – Мінск. : Бел. Энцыкл., 2001. – 207 с.
5. Баразна, М.Р. Выяўленчае мастацтва Беларусі XX стагоддзя / М. Р. Баразна. – Мінск : Беларусь, 2017. – 295 с.
6. Баразна, М.Р. Мастацтва кнігі Беларусі XX стагоддзя / М. Р. Баразна. – Мінск : Беларусь, 2007. – 239 с.
7. Барвенава, Г.А. Тэкстыль Сярэднявечча на землях Беларусі / Г. А. Барвенава. – Мінск : БДУКіМ, 2008. – 245 с.
8. Барока ў беларускай культуры і мастацтве / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2001. – 302 с.
9. Барока ў беларускай культуры і мастацтве: зб. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. – Мінск : Бел. навука, 1998. – 302 с.
10. Барока ў беларускай культуры і мастацтве: зб. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. – 3-е выд. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 306 с.
11. Беларускае барока: гіст.-тэарэт. праблемы стылю / Б.А.Лазука. – Мінск : Беларусь, 2001. – 143 с.
12. Беларускае мастацтва дваццатага стагоддзя: альбом-каталог / Рэсп. маст. выст. «Беларусь – трэцяму тысячагоддзю», 27 снеж. 2000 г. – 25 лют. 2001 г., 3–25 сак. 2001 г. – Минск : Четыре четверти, Нац. маст. музей Беларусі, 2003. – 264 с.
13. Беларусь у малюнках Напалеона Орды: другая палова XIX ст.: альбом / уклад.: А.М.Кулагін, У.А.Герасімовіч. – Мінск : Беларусь, 2004. – 143 с.
14. Борозна, М.Г. Белорусская живопись 1920–1970-х годов / М. Г. Борозна. – Минск : Белорусская государственная академия искусств, 2006. – 191 с.
15. Віннікава, М.М. Традыцыйны беларускі касцюм: альбом / М.М. Віннікава, П. Богдан. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – 301 с.
16. Воинов, А.А. История архитектуры Белоруссии: советский период: учеб. пособие для вузов по специальности № 1201 «Архитектура» / А. А. Воинов. – Мінск : Вышэйшая школа, 1975. – 213 с.
17. Высоцкая, Н. Ф. Іканапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў: альбом / аўт. тэксту і склад. Н.Ф.Высоцкая. – 6-е выд. – Мінск : Беларусь, 2001. – 230 с.

18. Высоцкая, Н. Ф. Жывапіс барока Беларусі: альбом / аўт.-склад. Н.Ф.Высоцкая. – Мінск : Беларус. Энцыкл., Мін. ф-ка каляр. друку, 2003. – 301 с.
19. Высоцкая, Н. Ф. Искусство Беларуси XII–XVIII вв. / Н. Ф. Высоцкая. – 3-е изд. – Мінск, 2002. – 26 с.
20. Высоцкая, Н.Ф. Сакральная живопись Беларуси XV–XVIII веков / автор текста и составитель Н. Ф. Высоцкая. – Минск : Беларусь, 2007. – 219 с.
21. Габрусь, Т.В. Саборы помняць усё: готыка і рэнесанс у сакральным дойлідстве Беларусі / Т. В. Габрусь. – Мінск : Беларусь, 2007. – 165 с.
22. Габрусь, Т.В. Мураваныя харалы: сакрал. архітэктура бел. барока / Т.В.Габрусь. – Мінск : Ураджай, 2001. – 286 с.
23. Габрусь, Т.В. Страчаная спадчына / Т.В.Габрусь [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2003. – 350 с.
24. Гісторыя беларускага мастацтва: у 2 т. / Б. А. Лазука. – Мінск : Беларусь, 2007.
25. Гісторыя Беларускага мастацтва: у 6 т. / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору /отв. С. В. Марцэлеў / Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987–1994.
26. Гісторыя беларускай кнігі: у 2 т. / пад агульнай рэдакцыяй М. В. Нікалаева. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2009–2011.
27. Грамыка, М.В. Беларускі пейзажны жывапіс першай паловы XX стагоддзя / М. В. Грамыка. – Мінск : Беларуская навука, 2011. – 164 с.
28. Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі: з музейных, прыватных збораў і карпаратыўнай калекцыі ААТ «Белгазпрамбанк»: каталог выставкі, 27.03–10.07.2014 / навуковы рэдактар Б. А. Лазука. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2014. – 629 с.
29. Дробаў, Л. М. Беларускія мастакі XIX стагоддзя / Л. М. Дробаў. – Мінск: Беларусь, 1971. – 109 с.
30. Дробаў, Л.Н. Графіка Беларусі XIX – пачатку XX стагоддзя / Л.Н.Дробаў. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 62 с.
31. Дробов, Л.Н. Живопись Белоруссии XIX – начала XX в. / Л. Н. Дробов. – Минск : Вышэйшая школа, 1974. – 332с.
32. Дробов, Л.Н. Живопись Советской Белоруссии (1917–1975 гг.) / Л. Н. Дробов. – Минск : Вышэйшая школа, 1979. – 302 с.
33. Жук, В.И. Декоративно-прикладное искусство Беларуси XVIII–XX вв.: становление и тенденции развития / В.И.Жук. – Минск : Белорусская наука, 2006. – 318 с.
34. Жук, В.И. Живопись Беларуси на рубеже веков: потери и обретения / В. И. Жук. – Минск : Беларуская навука, 2013. – 158 с.
35. Зайкоўскі, Э. М. Першабытныя помнікі паўночнай Беларусі / Э. М. Зайкоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 41 с.
36. История архитектуры Белоруссии: в 2 т./ В. А. Чантурия. – 3-е изд. переработанное и дополненное. – Минск, 1985.
37. Кулагин, А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии: вторая половина XVIII – начало XIX в. / А. Н. Кулагин. – Минск, 1981.
38. Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы Беларусі / А. М. Кулагін. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2008. – 487 с.
39. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: энцыкл. давед. / А.М.Кулагін. – Мінск : Бел. энцыкл., 2001. – 327 с.
40. Кулагін, А.М. Эклектыка: архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пач. XX ст. / А.М.Кулагін. – Мінск : Ураджай, 2000. – 302 с.
41. Кулагін, А.М. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии: вторая половина XVIII – начало XIX в. / А. Н. Кулагин. – Минск : Наука и техника, 1981. – 132с.
42. Кулагін, А.М. Шэдэўры архітэктуры ракако: гісторыка-архітэктурны нарыс / А. М. Кулагін. – Мінск : Полымя, 1991. – 71 с.
43. Кушнярэвіч, А.М. Культавае дойлідства Беларусі XIII–XVI стст.: гіст.і архіт.-археал.даслед. / А. М. Кушнярэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 149 с.
44. Кушнярэвіч, А.М. Мураваная дабастыённая фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага / А. М. Кушнярэвіч. – 2-е выд., дапоўненае. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 240 с.
45. Кушнярэвіч, А.М. Тыпалогія гатычнага абарончага культавага дойлідства Вялікага Княства Літоўскага / А. М. Кушнярэвіч. – Мінск : МДЛУ, 2007. – 142 с.
46. Лабачэўская, В.А. Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 375 с.
47. Лавыш, К.А. Художественные традиции восточной и византийской культуры в искусстве средневековых городов Беларуси (X–XIV вв.) / К. А. Лавыш. – Минск : Белорусская наука, 2008.

– 206 с.
48. Лакотка, А. І. Драўлянае сакральна-манументальнае дойлідства Беларусі / А.І.Лакотка. – Мінск : Беларусь, 2003. – 62 с.
49. Лакотка, А. І. Народнае дойлідства / А. І. Лакотка. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 199с.
50. Лобачевская, О.А. Белорусский народный текстиль: художественные основы, взаимосвязи, новации / О. А. Лобачевская. – Минск : Беларуская навука, 2013. – 527 с.
51. Лявонава, А. К. Старажытнабеларуская скульптура / А. К. Лявонава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 203с.
52. Медведский, А.В. Портретная живопись Беларуси: монография / А.В.Медведский, С.В. Медведский. – Витебск: ВГУ Им. Машерова, 2017. – 336 с.
53. Музей старажытнабеларускай культуры: мастацкія, этнаграфічныя і археалагічныя калекцыі / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Філіял «Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы». – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 87 с.
54. Нікалаеў, М.В. Палата кнігапісная: рукапіс.кн.на Беларусі ў X–XVIII стагоддзях / рэд. М.М.Розаў, А.С.Мыльнікаў. – Мінск : Маст.літ., 1993. – 239 с.
55. Пікулік, А.М. Мастацтва магілёўскіх старадрукаў / А.М.Пікулік. – Мінск: УП «Тэхнапрынт», 2002. – 199 с.
56. Пікулік, А.М. Мастацтва магілёўскіх старадрукаў / А.М.Пікулік. – Мінск : УП «Тэхнапрынт», 2002. – 199 с.
57. Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння / АН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 253 с.
58. Сарабьянов, В.Д. Спасо-Преображенская церковь Евфросиньева монастыря и ее фрески / В. Д. Сабьянов. – 2-е изд. – М.: Северный паломник, 2009. – 228 с.
59. Сахута, Я. М. Беларускае народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / Я.М.Сахута. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Беларусь, 2001. – 107 с.
60. Сахута, Я. М. Беларускае народнае кавальства / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2015. – 173с.
61. Сахута, Я. М. Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2011. – 367 с.
62. Сахута, Я. М. Беларуская выцінанка / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2008. – 227 с.
63. Селицкий, А.А. Евфросиния Полоцкая: ее храм, ее фрески / А. А. Селицкий. – Минск : Беларусь, 2016. – 180 с.
64. Селицкий, А.А. Живопись Полоцкой земли XI–XII вв. / А. А. Селицкий. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 171с.
65. Спадчына Беларусі: кніга-альбом / Аляксандр Аляксееў, Алег Лукашэвіч. – Мінск : А. А. Аляксееў, 2015. – 319 с.
66. Сто твораў XX стагоддзя: нарысы па гісторыі мастацтва і архітэктуры Беларусі найноўшага часу / С. В. Харэўскі. – Вільня [Вільнюс] : Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт, 2012. – 430 с.
67. Сучаснае беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. XXI стагоддзе [выяўленчы матэрыял]: альбом / аўтар тэксту, складанне, пераклад на беларускую мову: К. С. Аксёнава. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2013. – 395 с.
68. Сучасная беларуская скульптура. XXI стагоддзе [выяўленчы матэрыял]: альбом / аўтар тэксту, складанне, пераклад на беларускую мову: К. С. Аксёнава. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2012. – 358 с.
69. Сучасны беларускі жывапіс, XXI стагоддзе [выяўленчы матэрыял]: альбом / аўтар тэксту, складанне, пераклад на беларускую мову: К. С. Аксёнава. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2010. – 431 с.
70. Трусаў, А.А. Старонкі мураванай кнігі: манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму / А. А. Трусаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 190 с.
71. Францыск Скарына: энцыклапедыя / пад навуковай рэдакцыяй Г. Я. Галенчанкі, А. А. Сушы. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 2017. – 565 с.
72. Хадыка, А. Ю. Непаўторныя рысы: з гісторыі беларускага партрэта / А. Ю. Хадыка, Ю. В. Хадыка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 143 с.
73. Церашчатава, В. В. Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI–XVIII стст. / В. В. Церашчатава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 181с.
74. Цыбульскі, М.Л. Кантэксты жывапісу: гістарычная паэтыка і сучаснасць / М. Л. Цыбульскі. – Віцебск : Выдавецтва ВДУ, 2007. – 140 с.
75. Чантурия, Ю.В. Белорусское градостроительное искусство: средневековое наследие, ренессанс, барокко, классицизм в системе европейского зодчества / Ю. В. Чантурия. – Минск : Беларуская навука, 2017. – 503 с.

76. Чантурия, В.А. Памятники архитектуры и градостроительства Белоруссии / В. А. Чантурия. – Минск : Полымя, 1986. – 236 с.
77. Чарняўскі, М.М. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі / М. М. Чарняўскі. – Мінск : Народная асвета, 1981. – 62 с.
78. Чарняўскі, М.М. З глыбінь тысячагоддзяў / Міхаіл Чарняўскі. – Мінск : Народная асвета, 1978. – 124 с.
79. Чарняўскі, М.М. Неаліт Беларускага Панямоння / М. М. Чарняўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 140 с.
80. Шматаў В. Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI–XVIII стагоддзяў / В. Ф. Шматаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 181с.
81. Шматаў, В.Ф. Мастацтва беларускіх старадрукаў (XVI–XVIII стст.) / В.Ф.Шматаў. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – 129 с.
82. Шматов, В. Ф. Искусство книги Франциска Скорины / В. Ф. Шматов. – М. : Книга, 1990. – 205с.
83. Яницкая, М. М. Художественное стекло Советской Белоруссии / М. М. Яницкая. – Минск : Наука и техника, 1989. – 206 с.
84. Яніцкая, М.М. Беларускае мастацкае шкло (XVI–XVIII стст.) / М. М. Яніцкая. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 87с.
85. Яніцкая, М.М. Беларускае мастацкае шкло, XIX – пачатак XX ст. / М. М. Яніцкая. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 141с.
86. Яніцкая, М.М. Вытокі шкла免робства Беларусі / М. М. Яніцкая. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 158 с.
87. Ярашэвіч А.А. Абразы XVII–XIX стст.: са збораў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка: каталог / А.А. Ярашэвіч. – Мінск : Рифтур, 2012.